УДК 811.161.3’255.2=122.2

СПЕЦЫФІКА РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ КАТЭГОРЫІ ЭМОЦЫЙ У НАЦЫЯНАЛЬНА-МОЎНАЙ КАРЦІНЕ СВЕТУ (на матэрыяле фразеалагізмаў з кампанентам *вока/вочы* ў мове рамана Івана Мележа “Людзі на балоце” і яго перакладзе на нямецкую мову)

Старасціна Ганна Міхайлаўна
старшы выкладчык кафедры тэарэтычнай і прыкладной лінгвістыкі
Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова
(г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь)
e-mail: starostina@msu.by

*У артыкуле разглядаюцца семантычныя характарыстыкі фразеалагізмаў з кампанентам **вока/вочы**, рэпрэзентуючых катэгорыю эмоцый, у мове рамана Івана Мележа “Людзі на балоце”. Вызначаецца тып міжмоўнай эквівалентнасці пры перакладзе фразеалагізмаў на нямецкую мову, выяўляецца агульнае і спецыфічнае ў значэнні і функцыянаванні фразеалагізмаў.*

Ключавыя словы: фразеалагізм, кампанент *вока / вочы*, катэгорыя эмоцый, беларуская мова, нямецкая мова, пераклад, эквівалентнасць

*The article discusses the semantic characteristics of phraseological units with an **eye / eyes** component, representing the category of emotions, in the language of Ivan Melezh’s novel. The type of interlanguage equivalence of phraseological units translated into German is determined, the general and specific in the meaning and functioning of phraseological units are manifested.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Keywords: phraseological unit, *eye / eyes* component, category of emotions, Belarusian language, German language, translation, equivalence

Пераклад мовы мастацкага твора – гэта адна з найбольш складаных разнавіднасцей перакладу, у межах якой трэба ўлічваць шмат як лінгвістычных, так і экстралінгвістычных фактараў [1; 2; 3].

Мова твораў Івана Мележа багатая на звышслоўныя ўстойлівыя выразы розных тыпаў, многія з якіх не маюць адпаведнікаў ці эквівалентаў у іншых мовах, што стварае цяжкасці пры іх перакладзе, у тым ліку на нямецкую мову [3; 4; 5; 6; 7; 8; 9; 10]. Адной з разнавіднасцей устойлівых выразаў, што часта ўжываюцца ў мове твораў І. Мележа, з'яўляюцца саматычныя фразеалагізмы [11].

Пры дапамозе зроку чалавек спазнае навакольную рэчаіснасць. Тое, што ён бачыць, выклікае ў яго станоўчыя ці адмоўныя эмоцыі. Унутраныя перажыванні, псіхалагічны стан чалавека выяўляюцца на моўным узроўні ва ўстойлівых адзінках, асабліва ў фразеалагізмах з саматычным кампанентам.

Саматызм *вока / вочы* ў складзе фразеалагічных адзінак служыць сродкам характарыстыкі эмацыянальнага стану чалавека і рэпрэзентуе розныя віды эмоцый (станоўчыя, нейтральныя, адмоўныя).

Эмоцыю сораму актуалізуе фразеалагізм *вочы пазычыць*, напр.: *– Пакуль парадак у табары сваім навёў, – загаварыў Хоня, як заўсёды жвава, бадзёра, думаў спазнюся саўсім!* ***Вочы пазычыць****, баяўся, прыйдзецца!* // *"Ehe ich meine Sippe versorgt habe, das dauert seine Zeit", redete Chonja munter darauflos, wie es seine Art war. "Ich hatte schon Angst, dass ich der letzte bin, doch* ***was sehen meine Augen*** *– ich bin beinahe der erste!"*. Параўн.: *вочы пазычыць (у сабакі)* ('згарэць ад сораму') – *was sehen meine Augen* (дасл. 'што бачаць мае вочы'). Беларускамоўны фразеалагізм мае адметную нацыянальную семантыку і адлюстроўвае негатыўнае стаўленне да сабакі, бо, як лічылася, толькі вочы гэтай жывёлы маглі глядзець без сораму. На нямецкую мову ўстойлівая адзінка перадаецца кантэкстуальна, эмоцыя сораму ў перакладзе не адлюстроўваецца.

У наіўнай карціне свету *вочы* ўспрымаюцца як носьбіты інфармацыі пра маральнае аблічча асобы. Пачуццё сораму ў чалавека можа адсутнічаць і гэта таксама мае моўнае выражэнне, напр.: *Ён зарагатаў проста* ***ў вочы*** *ашалелай жанчыне і пайшоў сабе далей.* // *Er lachte der wütenden Frau* ***ins Gesicht*** *und zog ab*. Параўн.: *у вочы* ('адкрыта і нічога не хаваючы') – *ins Gesicht* (дасл. 'у твар'). У спалучэнні з дзеясловамі *рагатаць* / *lachen* фразеалагізмы дзвюх моў служаць сродкам негатыўнай ацэнкі персанажа

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

твора і падкрэсліваюць такія якасці, як нахабнасць, самаўпэўненасць і адсутнасць сораму.

У наіўнай карціне свету замацавана ўяўленне, што выраз твару і кірунак погляду могуць выяўляць сапраўдныя пачуцці чалавека. Міміка з'яўляецца ўніверсальным спосабам праяўлення эмоцыі сораму, збянтэжанасці: выраз твару чалавека змяняецца, ён апускае галаву, хавае вочы. І наадварот, пры адсутнасці пачуцця сарамяжлівасці ці збянтэжанасці выразных змяненняў мімікі не назіраецца. Гэта выражаецца і на моўным узроўні, напр.: *Ні боязні, ні шкадавання, ні якой-небудзь надзеі ці просьбы аб літасці – нічога не адбівалася на яго, здавалася, безуважным, халодна застылым твары. "Як скамянеў, – падумаў Шабета. –* ***Вокам не міргне****... Ну і тып, мабуць..." // Weder Angst noch Reue noch Hoffnung noch die Bitte um Erbarmen – keine Regung spiegelte sich teilnahmsloses, starres Gesicht wider. Wie versteinert, dachte Schabeta.* ***Zuckt nicht einmal mit der Wimper****. Sicher eine harte Nuss*. Параўн.: *вокам не міргнуў* ('не паказаў ніякай збянтэжанасці, боязі, нічым не выдаў сябе') – ням. *nicht mit der Wimper zucken* ('і вокам не міргнуць'; літаральна "не здрыганецца вейка"). Фразеалагізмы арыгінала і перакладу маюць розныя ўнутраныя асновы, аднак аднолькавую семантыку, вербалізуюць адсутнасць змяненне мімікі чалавека, які не паказвае ніякай збянтэжанасці, сораму.

Адмоўную ацэначнасць маюць і фразеалагізмы з кампанентам *вока / вочы*, што актуалізуюць **эмоцыю зайздрасці**. Так, адмоўна-ацэначнае адценне значэння рэпрэзентуе фразеалагізм *калоць вочы*, напр.: *Усё* ***вочы коле****, ва ўсё ўлезці гатовы з капытамі! // Alles* ***sticht*** *ihnen* ***in die Augen****, an allen haben sie herumzumeckern*. Параўн.: *коле вочы* ('што-н. выклікае зайздрасць; што-н. неадчэпна прыцягвае ўвагу') – *in die Augen stechen* ('кідацца ў вочы; абуджаць жаданне мець што-н.'; літаральна "ў вочы калоць"). Вока – вельмі адчувальны орган чалавечага цела, таму яно здольна вельмі хутка рэагаваць на розныя неспрыяльныя фактары (іншароднае цела і інш.), якія могуць выклікаць у воку колючы боль. У чалавека, які адчувае зайздрасць, таксама ўзнікаюць вельмі непрыемныя адчуванні. Гэтае назіранне адлюстравана ў фразеалагізме *калоць вочы*, які, апрача іншых значэнняў, здольны актуалізаваць і сему 'зайздрасць'. Нямецкамоўны фразеалагізм *in die Augen stechen* мае падобную ўнутраную форму, блізкае значэнне і таксама рэпрэзентуе эмоцыю зайздрасці.

Набліжаецца да эмацыянальнага стану **зайздрасць** такі стан чалавека, як **моцнае жаданне атрымаць што-н.** У залежнасці ад сітуацыі, гэта эмоцыя можа быць як станоўчай, так і адмоўнай. Саматычны фразеалагізм *вочы загарэліся*, рэпрэзентуючы эмоцыю моцнага жадання, у кантэксце

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

твора мае негатыўную канатацыю, напр.: *У гэтага смаркача, калі пачуў, колькі прыбавяць, аж* ***вочы загарэліся.*** *“От жа прагавітая дзюба!” // Der Grünschnabel* ***blitzte*** *gleich* ***mit den Augen*** *wie ein Habicht*. Параўн.: *вочы загарэліся* (‘каму-н. моцна захацелася нечага’) – ням. *mit den Augen blitzen* (літаральна “бліскаць вачыма”). У аснове беларускамоўнага фразеалагізма ляжыць метафара: хуткасць узнікнення жадання прыпадабняецца імгненнасці і ўсеахопнасці полымя. Дзеяслоўны кампанент устойлівай адзінкі *загарэліся* суадносіцца з прыродна-стыхійным кодам культуры і сімвалізуе імгненнасць дзеяння. У нямецкай мове адсутнічае эквівалентны фразеалагізм, таму беларускамоўная ўстойлівая адзінка перакладаецца кантэкстуальна.

Нейтральная **эмоцыя моцнага здзіўлення** выяўляецца ва ўстойлівым выразе *вочы на лоб лезуць*, напр.: *У Глушака* ***вочы палезлі на лоб****, так уразіўся чалавек // Hluschak's* ***Augen sprangen*** *beinah* ***aus dem Kopf*** **.** Параўн.: *вочы на лоб лезуць* (‘хто-н. выказвае вялікае здзіўленне’) – ням. *die Augen springen aus dem Kopf* (‘вочы на лоб лезуць’; літаральна “вочы выпрыгваюць з галавы”). Фразеалагізмы абедзвюх моў валодаюць аднолькавым значэннем, актуалізуюць адну сему ‘моцнае здзіўленне’, аднак у іх аснове ляжаць розныя вобразы і прасторавыя арыенціры. Ва ўстойлівым выразе арыгінала выяўляецца арыентацыя па вертыкалі ‘ніз – верх’, а ў фразеалагізме перакладу рэалізуецца бінарная апазіцыя ‘ўнутраны – знешні‘.

Вочы надаюць чалавеку здольнасць назіраць, бачыць прыгажосць навакольнага свету і захапляцца ёю. Станоўчая **эмоцыя захаплення, зачаравання** актуалізуецца і ў саматычных фразеалагізмах з кампанентам *вочы*, напр.: *Зіма дужэла патроху. То ціснулі зямлю халады і чыстай беллю – аж* ***адбірала вочы*** *– шырыліся палі, то мокла адліга – снег цямнеў, і, нудны, беспрасветны, церусіў дождж. // Der Winter näherte sich zögernd. Mal war die Erde hartgefroren, und das grellte Weiß auf den Feldern* ***blendete die Augen****, dann wieder setzte Tauwetter ein, der Schnee wurde dunkler, und ein lang anhaltender Nieselregen trübte die Sicht*. Параўн.: *адбірае вочы* (‘што-н. часова асляпляе сваёй прыгажосцю, неадчэпна прыцягвае ўвагу’) – ням. *blendete die Augen* (літаральна ‘сляпіла вочы’). Беларускамоўны фразеалагізм перакладаецца на нямецкую мову свабодным словазлучэннем, якое перадае значэнне ‘асляпляць вочы яркім святлом, перашкаджаць бачыць’, аднак не актуалізуе сему ‘захапленне, зачараванне’.

Даследаванне паказала, што акрамя розных тыпаў прасторава-часавых адносін, фразеалагізмам з кампанентам *вока / вочы* ўласціва значэнне стану (эмацыянальнага ці фізічнага), дзе часцей за ўсё вылучаецца адна дамінантная семантычная прымета.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Семантычная прыкмета ‘стан’ у фразеалагічных адзінках з кампанентам *вока/вочы* (колькасная рэпрэзентацыя)

Эмацыянальны стан	Арыгінал	Пераклад
Зайздрасць	3	3
Сорам	2	1
Адсутнасць сораму	3	2
Моцнае здзіўленне	1	1
Захапленне, зачараванне	1	0
Моцнае жаданне атрымаць што-н.	1	0

Дадзеныя табліцы дэманструюць колькасную неадпаведнасць наяўнасці дамінантнай прыкметы эмацыянальнага стану ў семантыцы фразеалагізмаў з кампанентам *вока/вочы* ў арыгінале і ў перакладзе. Гэты факт не сведчыць аб сэнсавай неадпаведнасці суадносных кантэкстаў на беларускай і нямецкай мовах, аднак дазваляе вылучыць агульныя і адметныя элементы нацыянальна-моўнай свядомасці носьбітаў дзвюх моў.

Спіс літаратуры

1. Старасціна, Г. М. Мастацкі пераклад: лінгвістычны аспект : дапам. / Г. М. Старасціна. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2009. – 76 с.

2. Старасціна, Г. М. Спецыфіка мастацкага перакладу: лінгвістычны і экстралінгвістычны аспекты // Веснік Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя А, Гуманітарныя навукі. – 2017. – № 10. – С. 132–135.

3. Старасціна, Г. М. Праблема перакладальнасці і эквівалентнасці ў тэорыі перакладу / Г. М. Старасціна // Актуальныя праблемы філалогіі і методыкі выкладання філалагічных дысцыплін : зборнік навуковых артыкулаў / пад агул. рэд. А. М. Макарэвіча. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2015. – С. 264–267.

4. Старасціна, Г. М. Прыёмы выкарыстання прыказак у рамане І. Мележа «Людзі на балоце» і спосабы іх перакладу на нямецкую мову / Г. М. Старасціна // Куляшоўскія чытанні : матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі, 26–27 красавіка 2006 г. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2006. – С. 196–201.

5. Старасціна, Г. М. Спосабы перакладу дзеяслоўных фразеалагізмаў (на матэрыяле рамана І. Мележа “Людзі на балоце”) / Г. М. Старасціна // Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся: праблемы вывучэння і захавання : зб. навук. артыкулаў / рэдкал.: А. А. Станкевіч [і інш.]. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2006. – С. 391–395.

6. Старасціна, Г. М. Стылістычна маркіраваныя і мадыфікаваныя фразеалагізмы ў раманах І. Мележа “Людзі на балоце”, “Завеі, снежань” і іх пераклад на нямецкую мову / Г. М. Старасціна // Весці БДПУ. Серыя 1, Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2007. – № 3. – С. 80–84.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

7. Старасціна, Г. М. Параўнальныя звароты ў рамане І. Мележа “Людзі на балоце” і іх пераклад на нямецкую мову / Г. М. Старасціна // “Мова – Літаратура – Культура” : матэрыялы V Міжнароднай навуковай канферэнцыі (да 80-годдзя прафесара Льва Міхайлавіча Шакуна), 16–17 лістапада 2006 г. – Мінск : БДУ, 2007. – С. 184–186.

8. Старасціна, Г. М. Спосабы перакладу узуальных фразеалагізмаў на нямецкую мову (на матэрыяле “Палескай хронікі” І. Мележа) / Г. М. Старасціна // Куляшоўскія чытанні : матэрыялы Міжнароднай навук.-практ. канферэнцыі, 24 красавіка 2010 г. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2010. – С. 84–90.

9. Старасціна, Г. М. Узуальныя і мадыфікаваныя парэміі ў раманах І. Мележа “Людзі на балоце”, “Завеі, снежань” і іх пераклад на нямецкую мову / Г. М. Старасціна // Итоги научных исследований ученых МГУ имени А. А. Кулешова в 2014 г. : сборник научных статей. – Могилёв : МГУ имени А. А. Кулешова, 2015. – С. 116–120.

10. Старасціна, Г. М. Індывідуальна-аўтарскія пераўтварэнні фразеалагізмаў і парэмій у мове мастацкай прозы (на матэрыяле рамана І. Мележа “Людзі на балоце”) / Г. М. Старасціна // Куляшоўскія чытанні : матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі, 21 красавіка 2016 г. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2016 г. – С. 155–158.

11. Старасціна, Г. М. Фразеалагізмы з кампанентам *душа* ў аспекце лакунарнасці (на матэрыяле рамана Івана Мележа “Людзі на балоце” і яго перакладу на нямецкую мову) / Г. М. Старасціна // Теоретические и практические предпосылки подготовки полилингвальных специалистов в вузе : материалы IV Междунар. науч.-практ. онлайн-семинара (вебинара), 30 марта 2018 г. / ред. совет: Л. Т. Килевая [и др.]. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2018. – С. 87–90.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова